# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

ЧАЦВЕР
2 верасня
1993 года
№ 11 (1698)


# ВІНШУЕМ ЦЯБЕ, СТУДЭНТ!

*Што і казаць, барацьба пад час апошняй абітурыенцкай кампаніі была надзвычай абвостранай. Калі ўлічыць, што план прыёму ў вышэйшыя навучальныя ўстановы рэспублікі быў скарочаны, то за 20 тысяч магчымых месцаў у 33 дзяржаўных навучальных установах змагаліся 40 тысяч чалавек.*

*А што ж у нашым універсітэце? З просьбай пракаменціраваць некаторыя лічбы і выказаць уласныя меркаванні наконт летняй экзаменацыйнай баталіі карэспандэнт «Беларускага універсітэта» звярнуўся да адказнага сакратара прыёмнай камісіі дацэнта Пятра Аляксеевіча ШУПЛЯКА:*

## ХТО ДА НАС ПРЫЙШОЎ?

— Пры плане прыёму 1585 чалавек было пададзена 3766 заяў. Гэта зусім не мала, калі ўлічыць, што сярод жадаючых вучыцца ў нашым універсітэце было 1664 медалісты (я называю і тых, хто закончыў прафесійна-тэхнічныя вучылішчы і сярэднія спецыяльныя ўстановы з «чырвоным» дыпломам). Нягледзячы на заўважны разрыў паміж спецыяльнасцямі і факультэтамі (скажам, на юрфаку на 125 месцаў прэтэндавала 305 медалістаў, на спецыяльнасці «Міжнароднае права» на 25—56, а на фізфаку на 140 — толькі 86), амаль на кожным з факультэтаў працэнт медалістаў быў даволі высокім. Наогул. адметнасць сёлетняй абітурыенцкай кампаніі ва універсітэце — высокі ўзровень ведаў паступаючых, што пацвярджае і вялікі конкурс, і высокі прахадны бал.

**— Лідэр сярод факультэтаў, безумоўна, бяссменны — юрфак?**

— Так.

**— А не ў пашане на гэты раз...**

— Вызначыць гэта вельмі складана. Салідны конкурс і магчымасць выбару існавалі на кожным з факультэтаў. Адбор ішоў жорсткі. Мне здаецца, што універсітэт тут на першым месцы. Ва ўсялякім выпадку сярод сталічных ВНУ.

**— Апошнім часам з'явілася нямала недзяржаўных навучальных устаноў, новыя спецыяльнасці ў традыцыйных ВНУ. Чым усё ж такі растлумачылі б Вы стабільную папулярнасць нашага універсітэта?**

— Ён проста быў і застаецца адзіным на Беларусі нацыянальным універсітэтам. Гэта і традыцыі, і ўзровень выкладання, а таксама вучэбная і навуковая база. Як бы ні называлі сябе іншыя, у бліжэйшы час наўрад ці зраўняюцца яны па гэтых паказчыках з Беларускім дзяржаўным універсітэтам.

Паўплывалі, зразумела, і знешнія абставіны. Скажам, выпускнікі педагагічных спецыяльнасцяў да гэтае пары маюць планавае размеркаванне, што ва ўмовах беспрацоўя гарантуе месца работы для выпускніка. Тым больш, што ў выхаванца універсітэта захоўваецца большая верагоднасць перамогі пад час конкурснага адбору на тое ці іншае месца.

**— Ці шмат было пададзена апеляцый?**

— Усяго 230. Больш за ўсё незадаволеных, як і след было чакаць, на юрыдычным факультэце — 99.

Апеляцыйнай камісіяй было зменена толькі 39 адзнак. Дарэчы, у двух выпадках яны былі зніжаны.



## РЭКТАРАТ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

аб'яўляе конкурс
на замяшчэнне пасад:

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: эканамічных навук; атамнай фізікі і фізічнай інфарматыкі; інтэлектуальных сістэм;

СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: геадэзіі і картаграфіі; крымінальнага права; стылістыкі і літаратурнага рэдагавання; англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў;

ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: эканамічнай геаграфіі замежных краін; гісторыі старажытнага свету і сярэдневечча; англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў;

АСІСТЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: фізіялогіі раслін; мікрабіялогіі; фізіялогіі чалавека і жывёл.

Тэрмін конкурсу — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

*Адрас: 220050, г. Мінск, праспект Скарыны, 4, Белдзяржуніверсітэт, аддзел кадраў, пакой 233, тэл. 26-59-39.*

## «БЕЛАРУСЬ — БАВАРЫЯ»

*Як паведамілі карэспандэнту «Беларускага універсітэта» ва ўпраўленні па міжнародных сувязях, 8—11 кастрычніка адбудзецца канферэнцыя «Беларусь — Баварыя» з удзелам прадстаўнікоў урадавых, прамысловых і навуковых колаў нашай рэспублікі і Германіі.*

Канферэнцыя — яшчэ адна спроба як мага шчыльней звязаць навуковую тэорыю з вытворчай практыкай.

У памяшканні Інфармацыйна-культурнага цэнтра, што па вуліцы Кастрычніцкай, каля 50 бізнесменаў Германіі, а таксама беларускія прадстаўнікі адпаведных галінаў прамысловасці будуць абмяркоўваць пытанні супрацоўніцтва. Вучоныя-эксперты дапамогуць ім распрацоўкай адпаведных рэкамендацый.

Магчыма, універсітэт рызыкуе, узяўшы на сябе адказнасць у ажыццяўленні настолькі значнай міжнароднай праграмы? Але падобна на тое, што паспяхова прыняўшы каля 20 дэлегацый розных міжнародных арганізацый, а таксама рэктараў універсітэтаў Еўропы і Азіі, адзіны сапраўды нацыянальны універсітэт на Беларусі паступова заваёўвае аўтарытэт у свеце.

ЛОМАНЫ ГРОШ

## ЯКІ ВЫКЛАДЧЫК НЕ МАРЫЦЬ СТАЦЬ БАНКІРАМ

Дзіўна, але факт застаецца фактам: і сёння народная адукацыя фінансіруецца па астаткаваму прынцыпу, а святкаванне светлых часін тармажэння падзення прэстыжу вышэйшай адукацыі і навукі адкладваецца на невядомы тэрмін. Ва ўсялякім выпадку, невялікае фінансавае расследаванне навявае сумныя думкі. Мяркуйце самі.

Толькі катэгорыя прафесара і дацэнта з вучонай ступенню ў чэрвені 1993 года мела зарплату некалькі вышэйшую за сярэднемесячную заработную плату рабочых і служачых на Беларусі. Дацэнт без вучонай ступені і старшы выкладчык з вучонай ступенню атрымлівалі прыкладна столькі ж, сколькі і сярэднестатыстычны грамадзянін рэспублікі. Усе ж астатнія аб такой колькасці грошай толькі марылі. Скажам, звычайны выкладчык за месяц работы меў толькі 30 тысяч рублёў Ды й кіраўнікам аддзелаў і службаў не пазайздросціш: на 30 тысяч разлічваў у чэрвені галоўны інжынер, 28 — начальнік аддзела кадраў, 26 — начальнік юрыдычнага аддзела.

У той жа час, калі меркаваць па афіцыйных звестках, месячны аклад рэктара універсітэта толькі на 21 тысячу рублёў перавышаў сярэднюю зарплату банкаўскіх работнікаў, а прафесар «разумнейшы» за «сярэдняга» банкаўскага работніка ўсяго на 2 тысячы рублёў.

Пакуль немагчыма параўнаць заработныя платы работнікаў розных галінаў гаспадаркі і вышэйшай адукацыі за жнівень, але, пэўна, суадносіны засталіся ранейшымі, калі разрыў не павялічыўся яшчэ больш.

Такім чынам, няма парадоксу ў тым, што за бягучы год значна ўзрос адток з універсітэта маладых вучоных і выкладчыкаў. Прагназіруемая змена сённяшняму пакаленню прафесараў — выпускнікі дактарантуры і аспірантуры, аддаюць перавагу камерцыйным структурам, якія гарантуюць заработную плату ў 3—4 разы вышэй за ўніверсітэцкую. Гэта не можа не турбаваць рэктарат і вучоны савет універсітэта. І, як нам здаецца, павінна падштурхнуць да актыўных дзеянняў работнікаў Міністэрства адукацыі, бо сацыяльная абарона работнікаў адукацыі і інтэлекту нацыі — клопат агульнадзяржаўны.

ПРАЦОЎНЫ ДЭСАНТ

## ТОЙ НЕ ЗВЕДАЎ АСАЛОДЫ, ХТО БУЛЬБАЧКУ НЕ ЗБІРАЎ

*Чуткі аб набліжэнні на Беларусь страшэннага голаду, здаецца, аказаліся значна перабольшанымі. Ураджай хлеба і бульбы, насуперак змрочным прагнозам, вяскоўцы вырасцілі неблагі. Прынамсі, чакаецца, што сёлета «другога хлеба» з гектара павінна быць сабрана на 40—50 цэнтнераў больш, чым у мінулым годзе.*

**Як заўсёды, у нашым неўладкаваным грамадстве пасля клопату аб ураджаі паўстае балючае пытанне аб тым, хто будзе яго збіраць. Хутчэй за ўсё, традыцыйная працоўная сіла — студэнты.**

**Згодна з загадам Мінадукацыі Рэспублікі Беларусь ад 23 жніўня гэтага года «Аб удзеле студэнтаў ва ўборцы ўраджаю», студэнты другога курса дзённай формы навучання нашага універсітэта ў перыяд з 2 па 30 верасня будуць спасцігаць навуку выжывання на палетках гаспадарак Валожынскага, Вілейскага, Старадарожскага, Нясвіжскага, Мядзельскага раёнаў Мінскай вобласці. А сапраўдны вучэбны год пачнецца для іх толькі ў кастрычніку.**

**Распрацаваныя і зацверджаныя ўмовы аплаты палявых работ для студэнтаў, і нам застаецца спадзявацца, што кожны з выкладчыкаў (многія з іх таксама будуць удзельнічаць у працоўным вераснёўскім дэсанце) знойдзе ў сабе сілы клапаціцца не толькі аб выхаванні і маральным воблiку 25 сваіх падапечных, але і аб строгім выкананні ўмоў дагавору.**

## АЎТАІМГНЕННЕ

Аперацыя «Пешаход». Чарговы напамін вадзіцелям і пешаходам аб уважлівасці і дысцыплінаванасці на дарогах. Мяркуючы па лічбах — 375 дарожна-транспартных здарэнняў з трагічным для здароўя і жыцця людзей зыходам за 7 месяцаў бягучага года ў Мінску — зусім не лішні. У выніку загінуў 61 чалавек, паранены — 357. Удзельнікамі 66 ДТЗ з'яўляюцца дзеці. Пяць з іх загінулі, а 63 паранены. Што ж, яблык ад яблыні недалёка коціцца, і калі бацькі «забываюцца» выкарыстоўваць для пераходу праезжай часткі ўстаноўленае месца, або не зважаюць на забараняючае святло светафора, дык чаго чакаць ад іх нашчадкаў, на вачах у якіх гэтыя парушэнні звычайна здзяйсняюцца? Праўда, у 12 ДТЗ вінаваты вадзіцелі. Іх неасцярожнасць загубіла 3 і пакалечыла 10 дзяцей.

ШТО НОВАГА?

## ВЕРНЕМСЯ ДА «ТАРАШКЕВІЦЫ»?

***З пастаяннай на часовую змянілася прапіска на тэрыторыі Беларусі існуючых Правілаў беларускай арфаграфіі і пунктуацыі, зацверджаных Акадэміяй навук і Міністэрствам асветы БССР яшчэ ў 1959 годзе.***

Праз 6 месяцаў утвораная не так даўно Дзяржаўная камісія па ўдакладненню правапісу беларускай літаратурнай мовы, на чале якой — старшыня Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны прафесар Ніл Сямёнавіч Гілевіч, а ў складзе — пісьменнікі В. Зуёнак, А. Клышка, Я. Брыль, Б. Сачанка, І. Навуменка, мовазнаўцы А. І. Падлужны, А. А. Крывіцкі, А. М. Булыха, першы намеснік міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь Л. К. Сухнат, іншыя даследчыкі і знаўцы нашай мовы і літаратуры, павінна ўнесці ў Савет Міністраў прапанову аб удакладненні існуючых правілаў беларускай літаратурнай мовы, а таксама падрыхтаваць новы звод правілаў беларускай арфаграфіі і пунктуацыі.

# ЧАС ЗБІРАЦЦА Ў «ШКОЛУ», ДЗЕТКІ!

***Рамонтныя работы ва ўніверсітэце, як сведчыць Уладзімір Іванавіч ТАРАСЕВІЧ, прарэктар па адміністрацыйна-гаспадарчай рабоце, завершаны пакуль не поўнасцю. Але гэта не перашкодзіць пачаць навучальны працэс і ніяк не паўплывае на паспяховасць студэнтаў — гатоўнасць па вучэбнаму фонду складае каля 95 працэнтаў.***

***Нешта цесна і ажыўлена стала ў калідорах, на лесвіцах, у холах універсітэта — заўважылі мы. Паглядзелі на каляндар — 31 жніўня. Час прачынацца. Студэнтаў з кожным днём становіцца ўсё больш, а гэта значыць, што ў буфеце можа не хапіць булачкі, вырастуць чэргі ў бібліятэку, гардэроб, бухгалтэрыю... На дошках з'явяцца аб'явы: «Хто знайшоў белую сумачку...» Адным словам, універсітэт ужо восьмы дзесятак пачынае з 1 верасня сваё звычайнае студэнцкае жыццё. А мы — выпуск сваёй газеты. Мяркуючы па тым, што свежыя нумары «БУ» не залежваюцца ў калідорах галоўнага корпуса, наша газета камусьці цікавая і карысная. Спадзяёмся, што гэта так.***

* Кожнаму студэнту — сваё месца

* Святкуйце дома

* Імпартная асадка ці Сальвадор Далі?

* А студэнты пачакаюць

## НА КОЛЬКІ МЕТРАЎ «ПАЦЯГНЕ» СТЫПЕНДЫЯ?

Усе універсітэцкія сталоўкі таксама ўжо адрамантаваныя і чакаюць пакуль там, нарэшце, з'явяцца доўгачаканыя чэргі галадаючых студэнтаў. Але, як сказаў нам **Павел Сяргеевіч СЕНЬ**, галоўны інжынер, існуюць цяжкасці з добраўладкаваннем у студэнцкім гарадку: напрыклад, у трэцім інтэрнаце зацягваецца рамонт ліфтаў, так што некаторы час студэнтам прыйдзецца бегаць на дванаццаты і трынаццаты паверх па прыступках (дарэчы, як і ва ўсіх інтэрнатах у выхадныя дні вахцёраў). Ёсць перабоі і з водазабеспячэннем у некаторых інтэрнатах.

Але, здараецца, не ўсё залежыць ад гаспадарчай службы. Колькі аконных рамаў і дзвярэй, выбітых студэнтамі, неабходна адрамантаваць? Напрыклад, устанавіць дзверы — 40 тысяч рублёў, а метр шкла каштуе ўжо каля тысячы. Так што раім студэнтам берагчы ў наступным навучальным годзе і дзяржаўнае дабро і сваю, між іншым, стыпендыю.

## БУДЗЕМ ЖЫЦЬ!

***На кожнага жадаючага і маючага патрэбу ў інтэрнаце студэнта знойдзецца сваё месца.***

***Пра такую прыемную навіну мы даведаліся ад Генадзя Уладзіміравіча ПАЦЕКІНА, намесніка старшыні прафсаюзнага камітэта студэнтаў.***

Дзевяць універсітэцкіх інтэрнатаў і дзесяты, які мы арэндуем у Акадэміі кіравання, падзелены кампетэнтнай камісіяй на катэгорыі. Для іх жыхароў гэта азначае, што больш утульныя і камфартабельныя пакоі будуць каштаваць даражэй за неўпарадкаваныя. Так, напрыклад, да чацвёртай катэгорыі прылічаны першы, чацвёрты, дзевяты і дзесяты інтэрнаты — студэнтам, якія будуць у іх жыць, прыйдзецца плаціць па 459 рублёў на месяц. На прыступку вышэй — трэці і шосты інтэрнаты — па 612. Жыхары сёмага і другога інтэрната раскашэляцца на 765 рублёў. Дарэчы, самым прэстыжным лічыцца восьмы інтэрнат. І плаціць прыйдзецца па першай катэгорыі — 918 рублёў на месяц.

Як бачым, аплата за пражыванне ў інтэрнаце ўсіх катэгорый вытрымана ў межах 10 працэнтаў ад мінімальнай стыпендыі, як і прадугледжвалася. Але студэнты будуць уносіць грошы толькі за чатыры месяцы, да студзеня — далей у залежнасці ад памера стыпендыі. Што датычыць практычна засялення і спісаў, то ў прафкоме заявілі: усё будзе, як заўсёды — цэнтралізавана і добра арганізавана.



## ПА ЧЫМ СТУДЭНТ?

***А зараз аб галоўным. Аб стыпендыі. У гэтым годзе студэнтам, нават двоечнікам, пашанцавала — стыпендыя за тры летнія месяцы была выдадзена раней, чым скончылася сесія. Але тым, хто пазней атрымаў «нездавальняюча», пакарыстаўшыся, грошыкі ўсё ж такі прыйдзецца вярнуць ва універсітэцкую казну.***

Тыя ж, хто здаў летнюю сесію на «выдатна», атрымаюць у верасні 10.710 «зайчыкаў», на «выдатна» і «добра» — 9.180, у дадатак да гэтага — даплату за жнівень і пераразлік за тры летнія месяцы. Мінімальная стыпендыя для ўсіх астатніх складзе 7.650 рублёў.

Навучэнцы мехмата і факультэта прыкладной матэматыкі ацэньваюцца даражэй. Паспяваючыя будуць атрымліваць мінімальную стыпендыю ў памеры 9.450 рублёў. Выдатнікі — 13.230, а тыя, хто займаецца на «добра» і «выдатна», — 11.340. Акрамя таго, студэнтам за асобныя поспехі ў вывучэнні асобных дысцыплін і навукова-тэхнічнай творчасці можа ўстанаўлівацца персанальная стыпендыя Савета ў памеры 10.800 рублёў.

Як бачым, ваганні на рынку каштоўных папер ніякім чынам не адбіліся на кошце студэнцкіх пакутаў. Калі ваўчэр падняўся, беларускі разліковы білет упаў, расійскі рубель застаецца стабільным у адносінах да амерыканскага долара, то «сярэдні» студэнт, па-ранейшаму, каштуе 85 працэнтаў ад мінімальнай заработнай працы.

## ЦІ ЁСЦЬ У СТУДЭНТАЎ СВАЕ СВЯТЫ?



З упэўненасцю можна сказаць — ёсць. І галоўнае — 1 верасня. Але не чакайце, што родны універсітэт яго вам падорыць. Яму не да гэтага. Як? — запытаеце вы. Ёсць жа ва універсітэце і студэнцкі клуб, і прафком, і Цэнтр маладзёжных ініцыятыў. Так, ёсць. Але Цэнтр не бярэ на сябе такую адказнасць, бо няма ў яго ні грошай, ні ініцыятыў. Прафком і студэнцкі клуб ніякіх каштоўных указанняў не атрымлівалі. У гэты складаны час рэктарат універсітэта распарадзіўся Дзень ведаў праводзіць па факультэтах. Таму святам будзе агульны факультэцкі сход з урачыстай прамовай дэкана. Адышлі ў нябыт вечары, капуснікі і нават дыскатэкі. Тусавацца на свае свята студэнтам прыйдзецца ў іншых месцах. Да прыкладу, у «Тройцы». Кава па-усходняму — 100 рублёў. Марожанае з шакаладам — 180 рублёў. Шампанскае «Делап'ер» — 10 штук. Стыпендыі выдатніка хопіць яшчэ на дзве-тры цыгарэты. Уваход на гарадскія дыскатэкі каштуе ад 500 да 3.000 рублё). Але справа нават не ў кошце. Штосьці з гэтых забаў студэнт здольны сабе дазволіць, бо ніколі, а тым больш сёння, стыпендыя не з'яўлялася для яго асноўным сродкам існавання. Справа ў тым, што губляецца адчуванне сябе ў стане студэнцтва, што з універсітэцкіх гадоў прыпомніць можна будзе толькі лекцыі, агульныя сходы і высокі плот уздоўж роднага будынку.

## ПАД РУЧКУ З ПАДРУЧНІКАМ

***Адна з крыніц паяўлення ў свет вучэбнай і дапаможнай літаратуры для студэнтаў увогуле і універсітэцкіх у прыватнасці — выдавецтва «Універсітэцкае».***

Па словах **Уладзіміра Канстанцінавіча КАСЬКО**, дырэктара выдавецтва, сабекошт аднаго падручніка на 300—400 старонак зараз складае да 1000 рублёў. Адна з прычын — высокія цэны на паперу: каля 600—650 тысяч рублёў за тону. Падручнікі ж прадаюцца па цэнах у 10 разоў ніжэйшых. Палову затрат пакрывае дзяржава. Астатняе — шукае выдавецтва. Таму сёння многія падрыхтаваныя да друку падручнікі чакаюць сваёй пары ў рэдакцыйных папках. Так, з 32 запланаваных на гэты навучальны год да выпуску ў свет падручнікаў будзе выдадзена ў хуткім часе толькі 27. Прычыны вядомыя: адсутнасць добра наладжанай сістэмы фінансавання паперы, належнай паліграфічнай базы.

Так што, шлях падручніка ад выдавецтва да універсітэцкай бібліятэкі ўсё яшчэ складаны. Але ў студэнтаў БДУ вялікіх падстаў для хваляванняў пакуль няма: **Ірына Уладзіміраўна АРЭХОЎСКАЯ**, дырэктар бібліятэкі, запэўніла, што падручнікаў хопіць усім. Выратоўваюць старыя запасы, фонд якіх складае каля 2 мільёнаў назваў. Праўда, падручнікавы «суверэнітэт» пакуль толькі мара — асноўная колькасць навінак па грамадазнаўчых курсах паступае з Расіі, што стварае дадатковыя цяжкасці з пералікам грошай. Ды й студэнтам давядзецца нейкі час карыстацца двухмоўем: канспектаваць лекцыі па-беларуску, і ў той жа час рыхтавацца па рускамоўных выданнях. Ну а студэнты-фізікі з гэтага года будуць атрымліваць частку навуковай перыёдыкі з далёкай Амерыкі.

**Хутчэй чым за год у выдавецтве «Народная асвета» былі падрыхтаваны да друку новыя падручнікі і дапаможнікі для вучняў сярэдняй школы. Яны, канешне, не ідэальныя, і быць такімі ў наш супярэчлівы час не могуць. Аднак ні вучням, ні настаўнікам ужо не трэба будзе шукаць звесткі па гісторыі і геаграфіі Беларусі ў старых газетах і часопісах. У сярэдняй школе пойдзе нармальны працэс выкладання дысцыплін на беларускай мове.**

**Студэнцтва абнадзеіць пакуль няма чым. Тут, гаворачы па-руску, «не до жиру»... Паспець бы ўзяць у бібліятэцы тое, што яшчэ засталося.**

### СПАЧУВАЕМ!



●●●

## АБ ЛАДЗЕ ЖЫЦЦЯ І СТЫЛІ ВУЧОБЫ

Не той пайшоў сёння студэнт, не той. Не купляе ён, як раней, стос агульных сшыткаў на кожны прадмет, пачак рознакаляровых алоўкаў, жменю шарыкавых асадак і кішэню гумак. Сённяшні студэнт абмяжоўваецца адным агульным сшыткам ці аб'ёмістым нататнікам і загадкавай імпартнай асадкай з магічнай цаной — 2.500. У магазінах канцтавараў таўкуцца толькі жоўтаротыя школьнікі і іх клапатлівыя бацькі, студэнцкі ж вопыт сведчыць — не стой у вераснёўскіх чэргах за канцтаварамі. Некалькі першых лекцый можна пахадзіць так проста. Лірычны настрой выкладчыкаў пасля працяглай разлукі са студэнтамі ўсё роўна не дазволіць сказаць ім нічога талковага. Пройдзе час, і ў магазінах зноў з'явіцца ўсё патрэбнае.

Але што рабіць тым студэнтам, якія прызвычаіліся весці ўзорны лад жыцця? Дзе ўзяць агульных сшыткаў на ўсе прадметы, калі ў рэспубліцы на аднаго навучэнца іх прыходзіцца ўсяго чатыры? Адзіны выхад — змяніць лад жыцця і стыль вучобы. Лекцыі па тых прадметах, на якія не хапіла сшыткаў, запамінаць. А калі без жартачак, то студэнты, сапраўды, бываюць розныя, і хтосьці ўсё ж такі жыве на адну стыпендыю. І калі філолагі і гісторыкі могуць укласціся ў тысячу — дзве, то матэматык толькі за калькулятар аддасць палову стыпендыі. А ёсць жа яшчэ і спартсмены. Вось каму не пашанцавала, дык не пашанцавала. Толькі кеды каштуюць 2.500 рублёў. А сапраўднаму спартсмену айчынных кедаў хапае максімум на пяць гульняў у футбол. Ад касцюма, і гэта адназначна, прыйдзецца адмовіцца адразу. Дастаткова майкі і спартыўных трусоў. Увогуле падыдзе любое адзенне. Бо ранішнія прабежкі можна рабіць, калі ўсе яшчэ спяць, а вячэрнія, калі ўжо заснулі.

Найцяжэй прыйдзецца аматарам айчыннай, а асабліва замежнай літаратуры і жывапісу. На шыкоўны альбом «Невядомы авангард» студэнту пазіраць непажадана,— там стаіць лічба ў 2,5 разы перавышаючая максімальную стыпендыю. Любое больш-менш каштоўнае выданне айчыннай класікі каштуе тысячу-дзве. Замежныя навінкі: томік Марселя Пруста — 1.740, раман Джойса «Уліс» — 2.700. Не кожны студэнт разумее сэнс такіх стратаў, таму ў большасці выпадкаў падрыхтоўка да вучобы абмяжоўваюцца на мінімуме: сшытак-асадка. І пройдзе яшчэ шмат часу пакуль наш студэнт зразумее розніцу паміж імпартнай асадкай і дзённікамі Сальвадора Далі.

